Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 49 (118)
ЧАЦВЕР
29
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СУСТРЭЦЬ ВЫБАРЫ НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

Выбарчая кампанія выклікала вялікі палітычны і вытворчы ўздым шырокіх мас працоўных нашай абласці. Калі ў газетах былі надрукаваны Ўказы Прэзідыумаў Вярхоўных Советаў СССР і БССР аб назначэнні дня выбараў, па ўсёй абласці, на ўсіх прадпрыемствах і вёсках пракацілася хваля масавых мітынгаў і сходаў. Сотні і тысячы аратараў у гарачых, хвалюючых прамовах гаварылі аб вялікім шчасці, якое прынесла прыгнечаным народам Заходняй Беларусі партыя Леніна—Сталіна, совецкая ўлада і яе доблесная Чырвоная Армія. Аратары гаварылі аб вялікіх правах, якія прадастаўляе сваім грамадзянам Сталінская Канстытуцыя: аб праве на працу, праве на адпачынак, праве на бясплатную асвету, праве на матэрыяльную забяспечанасць для перастарэлых. Гэтыя правы новыя грамадзяне СССР ужо рэальна адчуваюць і карыстаюцца імі.

Гэтыя вялікія правы народы Совецкага Саюза заваявалі ва ўпартай барацьбе з ворагамі ўнутры нашай краіны і ўне яе. Гэтыя вялікія правы заваяваны чэснай, высокапрадукцыйнай социялістычнай працай мільёнаў працоўных СССР. Народы СССР у першыя дні рэволюцыі, калі краіна была акружана вогненным кальцом імперыялістычных драпежнікаў, калі ў краіне не было хлеба, калі піцерскі рабочы клас атрымліваў асьмушку хлеба на чалавека ў дзень, праяўлялі подлінны гераізм, працавалі дзень і ноч, арганізоўвалі масавыя суботнікі, каб у краіне было больш паравозаў, больш машын, больш сродкаў узбраення, каб разбіць і знішчыць ворага. І гэта было дасягнута. Калі партыя павяла народ будаваць новыя гіганты індустрыі, каб зрабіць нашу краіну незалежнай ад капіталістычных краін, народ алмаўляў сабе ў многіх вырабах лёгкай прамысловасці, каб мець Магнітагорск, Кузнецкі завод, трактарныя заводы, заводы сродкаў узбраення. І гэта было дасягнута. І зараз, калі наша краіна стала магутнай і непрыступнай крэпасцю, калі пабудавана ў асноўным соцыялістычнае грамадства, народ працягвае з яшчэ большым энтузіязмам працаваць на блага сваёй любімай радзімы, каб пабудаваць светлы будынак комунізма.

У совецкага народа стала ўжо традыцыяй кожнае свята, кожную знамянальную дату сустрэць новым уздымам прадукцыйнасці працы, прыпаднесці новыя падарункі сваёй маці-радзіме. Гэту выдатную традыцыю ўспрынялі новыя грамадзяне СССР—працоўныя вызваленых абласцей Заходняй Беларусі. На прадвыбарчых сходах, прысвечаных пачатку выбарчай кампаніі, асобныя рабочыя, цэлыя калектывы бралі на сябе абавязацельствы датэрмінова выканаць план. Тэкстыльшчыкі, напрыклад, абавязаліся выканаць план першага квартала да 24 сакавіка—дня выбараў.

Важныя абавязацельствы ўзялі на сябе сяляне многіх вёсак нашай абласці. Сяляне Сапоцкінскага, Заблудаўскага, Аўгустоўскага, Скідзельскага і раду іншых раёнаў абавязаліся пабудаваць 166 кілометраў дарог. Сяляне вёскі Вісковіцы, Валкавыскага раёна, абавязаліся датэрмінова выканаць план лесавывазкі ў 928 кубаметраў і выклікалі на спаборніцтва сялян усёй абласці

Можна прывесці яшчэ дзесяткі падобных абавязацельстваў. Гэта гаворыць аб тым, што рабочыя і сяляне шчыра жадаюць адзначыць дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі. Уся справа за кіраўнікамі, за дырэктарамі трэстаў і фабрык, за работнікамі профсаюзаў, за раённымі партыйнымі, комсамольскімі і совецкімі арганізацыямі, за сельсоветамі. Кіраўнікі павінны ведаць, што абавязацельствы не ёсць яшчэ перамога, а толькі жаданне заваяваць гэту перамогу. Кіраўнікі абавязаны ўзначаліць патрыятычныя імкненні мас, іх гатоўнасць пераадолець любыя цяжкасці, каб ператварыць абавязацельствы ў канкрэтныя большэвіцкія справы.

На жаль, не ўсюды так абстаіць справа. За апошні час наглядаюцца перабоі ў рабоце асобных тэкстыльных фабрык. Дрэнна спраўляюцца са сваімі задачамі кіраўнікі трэста скуранай прамысловасці. Яны не дабіліся нармальнага забеспячэння матэрыяламі сваіх фабрык і заводаў. Многа абавязацельстваў прынята чыгуначнікамі, але транспарт працягвае працаваць з рук вон дрэнна. Не ўся справа ў снежных заносах, як гэта любяць чыгуначнікі гаварыць.

Многія раёны, як Беластоцкі, Парэцкі і Свіслацкі не падхапілі ініцыятыву сялян другіх раёнаў аб арганізацыі будаўніцтва дарог, аб датэрміновым выкананні планаў лесавывазкі. Гэта не робіць чэсці кіраўнікам даных раёнаў.

Да выбараў засталося 25 дзён. Кожны рабочы і селянін, узяўшы на сябе абавязацельствы, кожны кіраўнік павінны прыкласці ўсе свае сілы і сродкі, каб абавязацельствы былі выкананы, каб вялікую дату—24 сакавіка — сустрэць новымі вытворчымі перамогамі.

——«о»——

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 27 лютага на Карэльскім перашэйку нашы часці, пераадольваючы ўмацаванні праціўніка, занялі 13 абарончых умацаваных пунктаў, з іх 9 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў.

На іншых участках фронта не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя правяла ў радзе раёнаў паспяховую бамбардыроўку войск і ваенных аб'ектаў праціўніка. У паветраных баях збіта 6 самалётаў праціўніка.

СУСТРЭЧА КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ІВАНА АНТОНАВІЧА ТУРЛЕЙСКАГА З ВЫБАРШЧЫКАМІ

700 чалавек — выбаршчыкі Фабрычнай выбарчай акругі г. Беластока — сабраліся 27 лютага ў кіно-тэатры „Свабода“ для сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, тав. Турлейскім Іванам Антонавічам.

Вечар сустрэчы адкрывае старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Крыштафовіч.

Пасля даклада аб прадстаячых выбарах дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей слова прадастаўляецца Івану Антонавічу Турлейскаму. Цёпла сустрэлі выбаршчыкі свайго кандыдата. Яго змястоўная прамова, якая неаднаразова перапынялася апладысментамі, была выслухана з вялікай увагай.

Прамова тав. Турлейскага

Блізка дзень 24 сакавіка, калі, мы, новыя грамадзяне вялікай краіны соцыялізма, будзем упершыню выбіраць у вярхоўныя органы ўлады на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі.

Мы наглядна бачым, што прынесла нам геравічная Чырвоная Армія, што стварыла совецкая ўлада за 5 месяцаў. За такі кароткі перыяд яна стварыла больш чым буржуазна-памешчыцкі польскі ўрад за 20 год. Узяць хоць-бы пытанне аб ліквідацыі беспрацоўя. Беластоцкім аддзелам працы паслана на работу каля 20 тысяч беспрацоўных і бежанцаў, якія гадамі цягнулі жалкае існаванне. Сталінская Канстытуцыя забяспечыла ўсім грамадзянам права на працу.

Буржуазна-памешчыцкі польскі ўрад трымаў працоўных у цемнаце і бескультур'і. Больш мільёна дзяцей у былой Польшчы былі па-за школай. Зараз совецкая ўлада стварыла ўсе ўмовы для сапраўды ўсеагульнага бясплатнага навучання на роднай мове. Непісьменнасць сярод жанчын на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі дасягала 90 процантаў. Сотні вячэрніх школ для дарослых адкрыты зараз у нашай абласці.

Вазьміце любую галіну гаспадарчага і культурнага жыцця і вы пераканаецеся, як вялікі перамогі і дасягненні, здабытыя намі за месяцы совецкай улады.

Былая Польшча славілася сваім нацыянальным прыгнётам. Паны нацкоўвалі адну нацыянальнасць на другую. Толькі ў Совецкім Саюзе працвітае братэрства ўсіх народаў, усіх нацыянальнасцей.

Калі так званыя дэмакратычныя ўрады Францыі і Англіі гоняць мільёны працоўных на імперыялістычную бойню, то геравічная Чырвоная Армія вызваліла 13 мільённы народ Заходняй Беларусі і Украіны ад злапалучнай вайны. Дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы міру, нам забяспечана мірнае жыццё, мірнае будаўніцтва соцыялізма.

Нашы выбары, выбары на аснове Сталінскай Канстытуцыі, самыя свабодныя, самыя дэмакратычныя ў свеце. Ні ў адной краіне не было такога высокага проданта ўдзелу ў выбарах, такога аднадушнага галасавання за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, як у СССР. Бо ў СССР у выбарах удзельнічае ўвесь народ і выбірае сваіх, сапраўды народных прадстаўнікоў.

Выбары былі і ў панскай Польшчы. Але хто выбіраў і каго выбіралі? Пісалі і гаварылі, што трэба галасаваць за „рольнікаў“ Патоцкага, Радзівіла і іншых. А ў гэтых „рольнікаў“ было па тысячы і больш дзесяцін зямлі.

Цяпер мы выбіраем у вярхоўныя органы ўлады лепшых сыноў і дочак працоўнага народа. Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — гэта людзі, якія не ведаюць другіх інтарэсаў, чым інтарэсы народа. І я ўпэўнен, што 24 сакавіка ўсе выбаршчыкі аддадуць свае галасы за вылучаных кандыдатаў. Галасуючы за іх, мы будзем галасаваць за совецкую ўладу, за далейшы росквіт нашай радзімы, за вялікую партыю Леніна—Сталіна, за сваё шчаслівае і радаснае жыццё.

Тав. Турлейскі заклікае выбаршчыкаў быць пільнымі, выкрываць і выкарчоўваць усіх і ўсякіх ворагаў, якія будуць імкнуцца сарваць перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Затым тав. Турлейскі падрабязна расказвае сваю аўтабіяграфію і заканчвае сваю прамову словамі:

— Я разумею, што дэпутат—слуга народа. Калі польскія паслы былі адказны толькі перад богам, то нашы дэпутаты адказны перад сваімі выбаршчыкамі, перад народам. Я шчаслівы тым, што працоўныя аказалі мне вялікае давер'е. Клянуся ўсе свае сілы аддаць служэнню народу.

* * *

Пасля прамовы тав. Турлейскага выступіла работніца скурзавода тав. Яворская.

—Мы, рабочыя, карыстаемся зараз усімі правамі, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі. Па гэтай Канстытуцыі мы вылучаем сваіх кандыдатаў ў соцыялістычны парламент. Адным з такіх кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных з'яўляецца тав. Турлейскі. З радасцю пойдзем мы 24 сакавіка да выбарчых ўрнаў і аддадзім свае галасы за вернага сына рабочага класа тав. Турлейскага.

Апошнія словы тав. Яворскай былі пакрыты дружнымі апладысментамі ўсяго зала.

Вечар сустрэчы закончыўся праглядам кіно-фільма „На граніцы“.

Тэляс.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЯЎ СОЮЗА ССР

27 лютага Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР таварыш М. І. Калінін уручыў ордэны і медалі ўзнагароджаным.

За выдатныя заслугі ў справе развіцця рускага выяўленчага мастацтва, у сувязі з 50-годдзем мастацкай, навуковай і грамадскай дзейнасці, ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымоўвае заслужаны дзеяч мастацтваў тав. **І. Э. Грабар.**

— Сам факт узнагароджання работнікаў выяўленчага мастацтва, — гаворыць тав. **І. Э. Грабар,** — а іх узнагароджана ўжо некалькі чалавек — гаворыць аб вялікай розніцы паміж Совецкім Саюзам і царскай Расіяй. Ні адзін мастак мінулага часу: **Рэпін, Сурыкаў, Сероў** і іншыя, — не мелі ўзнагарод у царскай Расіі. Партыя і ўрад праяўляюць такія клопаты аб выяўленчым мастацтве, якія ўдзесяцераюць нашы сілы.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымоўвае таксама акадэмік тав. **А. Е. Фаворскі,** узнагароджаны ў сувязі з споўніўшымся 80-годдзем з дня нараджэння і 55-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці.

Ордэны і медалі ўручаюцца вялікай групе байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі, ўзнагароджаных за ўзорнае выкананне баявых заданняў урада і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць. У ліку ўзнагароджаных — старшыя лейтэнанты **А. І. Букераў, А. А. Быкаў, А. Б. Верхатураў,** капітан тав. **В. Н. Аверычаў,** чырвонаармейцы тт. **В. О. Дземідаў, І. М. Мурсалімаў, С. А. Усаў** і многа іншых таварышоў.

Ад імені ўзнагароджаных выступіў палітрук тав. **П. І. Анішчэнка,** які дзякуе партыі, ураду і таварышу Сталіну за аказанае давер'е і высокую ўзнагароду.

Узнагароды ўручаюцца таксама брыгаднаму інжынеру тав. **І. П. Кусакіну,** малодшаму камандзіру тав. **Г. І. Юдэнкову** і чырвонаармейцу тав. **Д. В. Дубіну,** узнагароджаным за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць.

Далей ордэны і медалі ўручаюцца вялікай групе работнікаў авіяцыйнай прамысловасці, узнагароджаныя за паспяховую работу па выкананню спецыяльнага ўрадавага задання. У ліку ўзнагароджаных — галоўны інжынер 1-га аддзялення 5-га праектна-монтажнага трэста Наркамата авіяцыйнай прамысловасці **Г. Г. Геваркян,** работнікі завода № 208; парторг ЦК ВКП(б) **Н. М. Іваноў,** токар тав. **Т. І. Галавешкін,** слесар тав. **Н. Н. Нікалаеў,** майстар тав. **Е. П. Васільева** і інш.

Ордэны і медалі ўручаюцца і іншым узнагароджаным ваенным і гаспадарчым работнікам.

Тав. **М. І. Калінін** павіншаваў таварышоў з атрыманнем узнагарод і пажадаў ім далейшых поспехаў.

(ТАСС).

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

ПОМНІК В. І. ЛЕНІНУ Ў ЕРЫВАНЕ

Пачалася падрыхтоўка да пабудовы манументальнага помніка В. І. Леніну ў сталіцы Арменіі — Ерыване. Ўрачыстае адкрыццё помніка прыўрочваецца к 20-годдзю Совецкай Арменіі, якое спаўняецца 29 лістапада гэтага года.

ЗБОРНІК ПРАЦ Н. К. КРУПСКАЙ

27 лютага споўнілася 1-я гадавіна з дня смерці Надзежды Канстанцінаўны Крупскай. Наркомасветы РСФСР выпускае зборнік прац Н. К. Крупскай аб бібліятэчнай рабоце, а таксама зборнік артыкулаў аб палітпрасветрабоце.

НА АМУРСТАЛЬБУДЗЕ

Комсамольск-на-Амуре. На будаўніцтве металургічнага камбіната Амурстальбудзе вялікае ажыўленне. Нядаўна туды прыбыў новы атрад будаўнікоў. Усяго ў пачатку другога квартала на будаўніцтве першынца далёкаўсходняй металургіі будзе занята каля 8000 чалавек.

НА КУРОРТАХ КРЫМА

Ялта. Вясна вызвала ўзмоцнены прыток прыбываючых у санаторыі і дама адпачынку. Большасць санаторыяў ужо адчынены. Вялікая ўвага ўдзяляецца амбулаторным хворым: яны будуць забяспечаны кватэрамі, харчаваннем, лячэннем. Расшыраецца санаторная сетка для дзяцей і падлеткаў.



Каля 80 тысяч розных кніг вышлюць бібліятэкі Растокінскага раёна г. Масквы ў заходнія абласці Беларусі і Украіны. Раённая чытальня імені І. С. Тургенева рыхтуецца да адпраўкі 4.000 кніг: 1.000 кніг — мастацкай і 3.000 — соцыяльна-эканамічнай літаратуры.

На здымку: бібліятэкары С. Т. Барысава (злева) і Т. Ф. Чэрнова за адборам кніг. (Фота-кліштэ ТАСС).

ПАДРЫХТОЎКА ТРАКТАРЫСТАЎ

У заходніх абласцях Украіны і Беларусі разгортваецца падрыхтоўка трактарыстаў. Курсы трактарыстаў адкрыліся у вёсцы Дубой, Жабчынскага раёна, Пінскай абласці. Займаецца 140 чалавек, у тым ліку — 18 жанчын. У Крэменецкай сельскагаспадарчай школе, Тарнопальскай абласці рыхтуецца 95 трактарыстаў і 49 камбайнераў.

ЛЕВЕНФІШ — АЛАТОРЦАЎ

27 лютага ў Маскве адбылася шостая партыя шахматнага матча Левенфіш — Алаторцаў.

Партыя адкладзена з лішняй фігурай у Алаторцава, у замен якой Левенфіш мае дзве прахадных пешкі. У прарванай пазіцыі Левенфішу прыдстаіць змагацца за дасягненне ніч'ёй.

РАДЫЁМАГІСТРАЛЬ МАСКВА — ХАБАРАЎСК

Народны Камісарыят Сувязі СССР заканчвае работы па ўдасканаленню самай доўгай у свеце радыёмагістралі Масква — Хабараўск. Тэхнічнае пераўзбраенне магістралі карэнным чынам паляпшае радыёсувязь паміж сталіцай Совецкага Саюза і Далекім Усходам. У тры — чатыры разы павышаецца прапускная здольнасць лініі.

БАГАЦЦІ ЎСХОДНІХ КАРПАТ І ІХ ПРАДГОР'ЯЎ

Брыгада совецкіх геолагаў, выязджаўшая ў раёны Ўсходніх Карпат (Заходняя вобласць Украіны) выявіла больш, чым у 100 пунктах адзнакі нафтаноснасці. Совецкія вучоныя наметілі абшырную праграму даследвання і далейшага вывучэння нафтавых, вугальных і саляных багаццяў Усходніх Карпат і іх прадгор'яў.

(ТАСС).

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 354 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ЗА НАРОДНАГА НАСТАЎНІКА АБРАМА ГЕШЭЛЕВІЧА МАШЭВІЦКАГА!

Абрам Гешэлевіч Машэвіцкі

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

У глыбокай задуме ён сядзеў за сталом прэзідыума настаўніцкага схода. Аратар толькі што назваў яго імя. Зал апладыраваў. Але ён, здавалася, не чуў і не бачыў, што адбывалася вакол яго. Ен рыхтаваўся да выступлення. Перад вачыма прыпаднялася густая заслона часу і пройдзены жыццёвы шлях паўстаў ва ўсіх падрабязнасцях. Ён у думках яшчэ раз прайшоўся па ім і, калі старшынствуючы прадаставіў яму слова, спакойнай, упэўненай паходкай ён накіраваўся к трыбуне.

— Таварышы! Дазвольце прынесці вам глыбокую ўдзячнасць за давер'е, якое вы аказалі мне, радавому школьнаму работніку, які не адчувае за сабой асаблівых заслуг, але які чэсна і добрасумленна выконваў свае абавязкі, як і многія мае таварышы. Падобна тысячам чэсных працаўнікаў, я многа ўжо пражыў і перажыў, але жыццё пачалося нядаўна, у той гістарычны дзень, калі доблесная Чырвоная Армія, выконваючы волю ўрада СССР і таварыша Сталіна, прышла да нас, каб вызваліць брацкія народы Заходняй Беларусі ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Ён гаварыў аб сабе спакойна, можа нават занадта ціха, без жэстаў, так як гавораць з сябрамі. Вось некаторыя моманты з жыццёвай дарогі, пройдзенай Абрамам Гешэлевічам Машэвіцкім за 45 год.

* * *

Нарадзіўся ў 1894 годзе ў сям'і беластоцкага саматужніка. Бацька выраблях дзяшовыя скураныя кашалькі, а маці хадзіла па бліжэйшых мястэчках і прадавала іх.

Шэрым і бязрадасным было дзяцінства Абрашы. Спачатку яго аддалі ў хедэр, а потым у ешыбот. Муштра і зуброжка незразумелага, нікому не патрэбнага талмуда не гарнулі сэрца хлопчыка да ешыбота. Ён хадзіў туды толькі таму, што пасылалі бацькі. У 1906 г., пасля крывавага яўрэйскага пагрому, Абрам Машэвіцкі канчаткова зненавідзеў ешыбот, зненавідзеў рэлігію, многае па новаму зразумеў у жыцці.

Тав. Машэвіцкі добра памятае жудасныя дні лета 1906 года. У польскую працэсію хтосьці кінуў бомбу. Гэта паслужыла повадам для прадажных царскіх сабак — чарнасоценцаў, каб наладзіць яўрэйскі пагром, паліць вуліцы Беластока кроўю працоўных.

Калі пачаўся пагром, 12-гадовы Абраша быў у ешыбоце. Стары рэбэ сабраў дзяцей у вялікім зале і пад выстралы і крыкі, што даносіліся з вуліцы, чытаў лекцыю аб «вялікіх ворагах нашых», за якія «ўсемагутны паслаў пакаранне».

Дзеці, што жылі пабліжэй, разбегліся па дамах, дзяцей багатых рэбэ прытуліў у сябе, а Абраша Машэвіцкі і двое яго таварышоў засталіся адны ў вялікім пустым пакоі. Яны знайшлі кавалак бруднай рагожы і, моцна прыцісну́ўшыся адзін да аднага, дрыжэлі ад страху.

Гэта была жудасная ноч. Ешыбот знаходзіўся недалёка ад ваенных казармаў і ад стрэлаў дрыжэлі вокны. Дзесьці зусім блізка лементавала жанчына, адтуль-жа далятала грубая мацяршчына. Водбліскі пажару коса клаліся на сцяну і столь, у зале панаваў злавесны поўзмрок.

Назаўтра раніцой, перамогшы страх, Абрам Машэвіцкі накіроўваецца дамоў. Вакол свішчаць кулі, бушуе полымя. Падобна шакалам рыскаюць чарнасоценцы. Да слёз боязна. Але непакой за лёс бацькоў бярэ верх, і Абраша бяжыць. На Юравецкай вуліцы ўслед яму страляе жандар. Куля прасвістала, зачапіўшы толькі рукаў. Хлопчык упаў ад перапалоху. Хтосьці ўцягнуў яго ў двор.

Толькі на трэці дзень галодны знясілены Абраша дабраўся дадому. Але дома фактычна не было — яго разбурылі ў час пагрому. Многія сябры Машэвіцкага не далічыліся ў гэты дзень сваіх радных.

Падзеі 1906 года паставілі перад Абрашай рад пытанняў, на якія ён пакутліва шукае адказы. Ясна была адно: яго нага больш не ступіць у ешыбот. Ён навучыўся ненавідзець. Іменна ў той час у Абрама Гешэлевіча склалася цвёрдая думка стаць не рабінам, як гэтага жадаў бацька, а настаўнікам. На гэтай глебе былі нелады з бацькам: прышлося нават прыбегнуць да «галадоўкі», але 12-гадовы хлапчук настаяў на сваім.

Не мала цяжкасцей трэба было перажыць, каб паступіць і вучыцца ў гімназіі. Будучы ў старшых класах гімназіі, Машэвіцкі зарабляў прыватнымі ўрокамі, у 1914 г. ён скончыў гімназію.

У 1915 г. Беласток занялі немцы. Абрам Гешэлевіч працуе ў камітэце па дапамозе бежанцам. У яго зараджаецца ідэя арганізаваць народную яўрэйскую школу для дзяцей беднаты. Стварэнне школы на разгаворнай народнай мове, на «жаргоне», як яе тады называлі, — у той час лічылася чуць не рэвалюцыйнай падзеяй. На Машэвіцкага глядзелі коса, ён не атрымліваў ніякай дапамогі. Не было ні падручнікаў, ні праграм. Высмейвалі нават некаторыя з таварышоў, называлі ўтапістам. Толькі дзякуючы напорыстасці Машэвіцкага школа была створана.



— Для мяне, — расказвае тав. Машэвіцкі, — работа ў гэтай школе стала галоўнай мэтай жыцця. Таму што з гэтай работай было звязана выхаванне дзяцей у духу інтэрнацыяналізма, любві да рабочага класа, нянавісці да капіталізма, у духу рэвалюцыйным і антырэлігійным.

Тав. Машэвіцкі быў народным настаўнікам у лепшым сэнсе гэтага слова. Ён нёс асвету ў самыя нізы яўрэйскай беднаты. Ён выхоўваў змагароў за справу працоўных. За 24 годы педагагічнай дзейнасці Абрам Машэвіцкі выхаваў не адзін дзесятак людзей, якія прысвяцілі сваё «жыццё» благароднейшай з задач — барацьбе за вызваленне працоўных. Былы вучань Машэвіцкага Словес Хаім, перанёсшы многа лішэнняў, прасядзеўшы ў турме больш чатырох год, працуе зараз сакратаром у Торэза — генеральнага сакратара комуністычнай партыі Францыі. Былы вучань Машэвіцкага Гелер Хаім — адзін з актыўнейшых комуністаў-падпольшчыкаў —10 год прасядзеў у турме за справу працоўных. Многія вучні Абрама Гешэлевіча працуюць на адказнай партыйнай і іншай рабоце ў Совецкім Саюзе і другіх краінах.

Выхаванне дзяцей у школе Машэвіцкага адрознівалася ад выхавання ў польскіх школах. Кожны дзень на працягу 10 — 15 мінут Машэвіцкі знаёміў дзяцей з жыццём у Совецкім Саюзе, з палітычнымі падзеямі, праводзіў гутаркі па інтэрнацыянальнаму выхаванню.

Вучні любілі Абрама Гешэлевіча, бо бачылі ў ім сапраўднага друга беднаты. Аб гэтым сведчыць той факт, што былыя вучні Машэвіцкага не парываюць сувязі са сваім настаўнікам да апошняга дня. Пры школе быў гурток скончыўшых школу, які дапамагаў школе наладжваць культурныя вечары. Зборы ад гэтых вечароў ішлі ў фонд МОПР'а.

Працоўныя Беластока ведалі Абрама Машэвіцкага не толькі як настаўніка народнай яўрэйскай школы. Ён быў арганізатарам і кіраўніком клуба рабочай моладзі. Гэты клуб праводзіў культурна-асветніцкую работу з маладымі яўрэйскімі рабочымі, супроцьпастаўляў сябе клубам бунда і сіяністаў. Летам для рабочай моладзі Абрам Гешэлевіч арганізоўваў лагеры.

Запомніўся адзін выпадак з жыцця лагера.

Гэта было ў жніўні 1939 года. Абрам Гешэлевіч з моладзю накіраваліся лесам да возера, каб выкупацца. У жывапіснай мясцовасці ляжыць гэта возера.

— Мы падыходзілі ўжо да возера, — расказвае тав. Машэвіцкі, — як раптам пачулі сярдзіты вокліч: «Прэч з лесу, жыды! Страляць буду!» Мы вымушаны былі вярнуцца. Так панскі ляснік не дапусціў яўрэйскую моладзь нават блізка да возера.

Вечарам у лагеры тав. Машэвіцкі выкарыстаў гэты выпадак для гутаркі на інтэрнацыянальную тэму. Ён многа гаварыў аб Совецкім Саюзе, дзе няма нацыянальнай няроўнасці, дзе ўсе багацці належаць працоўным. Сваю гутарку тав. Машэвіцкі закончыў словамі:

— Я ўпэўнен, што недалёк той час, калі панскі лакей не пасмее нас гнаць з лесу, з нашай роднай зямлі.

Маладыя рабочыя доўга не клаліся спаць у гэту ноч. Узрушаныя, яны спявалі «Песню аб радзіме». Па лесе разносіліся словы:

«Широка страна моя родная,
Много в ней лесов, полей и рек.
Я другой такой страны не знаю
Где так вольно дышит человек.»

Калі праз месяц прышла Чырвоная Армія, першымі да Машэвіцкага прыбеглі яго былыя вучні Кац і Памеранец. Са слязамі радасці на вачах яны віншавалі свайго дарагога настаўніка з вызваленнем, з найвялікшым шчасцем. «Памятаеце, настаўнік, тую ноч у лесе? Вашы словы ажыццявіліся. Зямля стала нашай і ніхто не пасмее нас гнаць з яе». Вучні Машэвіцкага першыя ўстанавілі чырвоны сцяг на высокім будынку дзяржбанка.

На другі-ж дзень пасля прыходу Чырвонай Арміі Абрама Гешэлевіча прызначылі членам часовага ўпраўлення горада Беластока. Працуючы на новым пасту, тав. Машэвіцкі быў сапраўдным слугой народа. Ён уважліва выслухоўваў кожнага наведвальніка і прымаў усе меры, каб задаволіць яго просьбу. Больш 20 сямей беднаты, якія ў выніку эксмісіі (выгнання з кватэры за неўплату), аказаліся на вуліцы і жылі з дзецьмі, старыкамі пад вуглом сінагогі, — былі ўселены ў кватэры пры садзейнасці тав. Машэвіцкага — члена часовага ўпраўлення.

Народ выбраў тав. Машэвіцкага дэпутатам Народнага Сабрання, і Абрам Гешэлевіч выканаў волю народа — ён галасаваў за совецкую ўладу.

Зараз тав. Машэвіцкі працуе намеснікам загадчыка гарадскога аддзела народнай асветы і метадыстам. З усёй страснасцю і адданасцю ўзяўся ён за справу рэарганізацыі і советызацыі школы. Настаўнікі бачаць у ім чулага ўважлівага таварыша і заўсёды атрымліваюць ад яго патрэбную метадычную дапамогу.

Часта ў пакой № 17 Горвыканкома прыходзяць наведвальнікі. І не толькі па школьных пытаннях. Да тав. Машэвіцкага ідуць людзі, каб падзяліцца сваімі радасцямі і гаротнасцямі, параіцца, пагутарыць. Ён усіх прымае, выслухоўвае і па меры сваіх сіл дапамагае ў задавальненні іх просьб.

Чвэрць века прысвяціў Машэвіцкі справе народнай асветы. Гэта— выключна скромны, але глыбокі і дзелавіты, да канца адданы справе працоўных, справе партыі Леніна — Сталіна чалавек. Настаўнікі горада Беластока вылучылі тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Акруговая прадвыбарчая нарада падтрымала іх прапанову, а выбарчая камісія 354 выбарчай акругі зарэгістравала тав. Машэвіцкага кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Тав. Машэвіцкі — верны сын працоўнага народа. Ён будзе дастойным дэпутатам соцыялістычнага парламента.

Выбаршчыкі 354 выбарчай акругі, галасуйце за тав. Машэвіцкага! Ён апраўдае ваша давер'е.

Т. Лясовіч

Вялікія заваёвы працоўных СССР

Права на адпачынак

У вялікай краіне соцыялізма дзяржава паўсядзённа праяўляе выключныя клопаты аб чалавеку. У нас людзі, як сказаў таварыш Сталін, з'яўляюцца самым дарагім, самым цэнным з усіх капіталаў. Совецкія людзі не ведаюць голада, беспрацоўя, жорсткай эксплаатацыі — гэтых неміну́чых спадарожнікаў капіталістычнага ладу. Клопаты аб працоўных, аб іх здароўі — асноўны закон соцыялістычнай дзяржавы.

Совецкая ўлада з першых-жа дзён свайго існавання правяла рад выдатных мерапрыемстваў, накіраваных к арганізацыі культурнага адпачынку працоўных і ўмацаванню іх здароўя. Вясной 1919 года — у дні, калі маладая Совецкая рэспубліка змагалася з полчышчамі белагвардзейцаў і інтэрвентаў, Совет Народных Камісараў выдаў за подпісам Уладзіміра Ільіча Леніна дэкрэт, па якому ўсе лячэбныя мясцовасці і курорты, дзе-б такія на тэрыторыі рэспублікі ні знаходзіліся і каму-б яны ні належалі, з усімі пабудовамі аб'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю і перадаюцца народнаму камісару ахову здароўя для арганізацыі лячэння і адпачынку працоўных.

Совецкая ўлада не толькі хутка аднавіла разбураныя ў імперыялістычную і грамадзянскую войны курорты, але і пабудавала вялікую колькасць новых курортаў, санаторыяў, дамоў адпачынку.

Нябачаныя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва, асабліва ў апошнія годы, забяспечылі працоўным здаровы і культурны адпачынак.

Права на адпачынак запісана ў залатой кнізе народаў СССР— вялікай Сталінскай Канстытуцыі. У арт. 119 Канстытуцыі сказана:

«Грамадзяне СССР маюць права на адпачынак. Права на адпачынак забяспечваецца скарачэннем рабочага дня для пераважнай большасці рабочых да 7 гадзін, устанаўленнем штогодных водпускаў рабочым і служачым з захаваннем заработнай платы, прадастаўленнем для абслугоўвання працоўных шырокай сеці санаторыяў, дамоў адпачынку, клубаў».

Працоўныя Совецкага Саюза маюць самы кароткі ў свеце рабочы дзень і штогод карыстаюцца аплачваемым водпускам. Яны не турбуюцца аб заўтрашнім дні. Іх не палохаюць голад, нішчата і лішэнні ў выпадку захворвання, няшчаснага выпадку, інваліднасці ці наступіўшай старасці. Яны ведаюць, што аб іх паклапоціцца дзяржава, якая прадастаўляе ўсяму насельніцтву краіны бясплатнае лячэнне, выплачвае дапамогу часова страціўшым працаздольнасць, а інвалідам і старыкам выплачвае пенсіі.

У СССР маецца звыш 250 курортаў і лячэбных мясцовасцей з агульнай колькасцю ў 120.000 санаторных ложкаў. Большасць гэтых курортаў працуе на працягу ўсяго года. На іх лечыцца і адпачывае штогод звыш аднаго мільёна працоўных: рабочых, служачых, сялян, калгаснікаў.

Апрача ўсесаюзных курортаў, ва ўсіх рэспубліках, краях і абласцях маецца вялікая колькасць мясцовых санаторыяў, у якіх каля 100.000 ложкаў.

Прафесіянальныя саюзы маюць звыш 200 уласных санаторыяў і амаль 800 дамоў адпачынку.

Для перастарэлых і інвалідаў пабудаваны спецыяльныя санаторыі і дамы адпачынку.

Толькі за адзін 1939 год каля трох мільёнаў працоўных атрымала бясплатны адпачынак і лячэнне за кошт прафесіянальных саюзаў, якія выдаткавалі на гэта да мільярда рублёў.

Нічога падобнага, вядома, няма і не можа быць ні ў адной капіталістычнай краіне; не было гэтага і не магло быць у панскай Польшчы.

З кожным годам у СССР будуецца ўсё больш санаторыяў і дамоў адпачынку. Адкрываецца многа новых курортаў. Хутка растуць курорты сонечнага поўдня совецкай краіны — Каўказскага і Крымскага пабярэжжаў Чорнага Мора (Ялта, Алушта, Алупка, Сімеіз, Сочы-Мацэста, Гагры, Сухумі і т. д.).

Адкрыты дзесяткі новых санаторыяў у жывапісных месцах Сібіры, Урала, Далёкага Ўсхода, Сярэдняй Азіі, у сасновых лясах Падмаскоўя, на Украіне.

Вялікая ўвага ў Совецкай краіне ўдзяляецца лячэнню дзяцей і падлеткаў. Дастаткова ўпамянуць аб вядомым піонерскім лагеры «Артэк» (у Крыму, ля Чорнага мора), аб «украінскім Артэку» (у Одэсе, ля Чорнага мора), аб дзіцячых санаторыях Еўпаторыі.

Свой водпуск працоўныя СССР праводзяць не толькі ў санаторыях ці дамах адпачынку. Сотні тысяч людзей робяць захапляючыя падарожжы па прыгажэйшых месцах краіны.

У выхадныя дні мільёны гарадскіх жыхароў выязджаюць у лясы, адпачываюць у цяністых парках культуры і адпачынку, наведваюць стадыёны, прымаюць удзел у спартыўных гульнях і спаборніцтвах. Паркі, стадыёны маюцца і ў многіх сельскіх мясцовасцях. Да паслуг адпачываючых — тэатры, клубы, разнастайныя відовішчы і забавы. 7-гадзінны рабочы дзень дае магчымасць працоўным наведваць тэатры, многа чытаць, вучыцца, займацца спортам і т. д.

Права чалавека на адпачынак — адно з найвялікшых дасягненняў краіны соцыялізма. Гэта права атрымалі цяпер і новыя грамадзяне СССР — жыхары заходніх абласцей Украіны і Беларусі.

Г. Міцерэў,

Народны Камісар Аховы Здароўя СССР

ЧЫЖАЎСКІ РАЁН НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ Ў АВАНГАРДЗЕ МАС

Новым светлым жыццём зажылі сяляне Чыжаўскага раёна. Векавая мара і барацьба сялян з памешчыкамі за зямлю канчаткова вырашана з першых дзён савецкай улады. Батракам, беднякам і маламоцным серадням раёна перадана 3.400 га ворнай зямлі былых памешчыкаў, 500 кароў з маёнткаў паноў бясплатна атрымалі тыя сяляне, якія пры існаванні ненавіснай ім польскай улады не мелі магчымасці набыць і трымаць карову. У першую савецкую вясну 225 сялянскіх гаспадарак раёна выедуць на свае палі на конях, якіх яны атрымалі з знішчаных назаўсёды памешчыцкіх маёнткаў.

За гэту найвялікшую дапамогу працоўныя сяляне ад усяго сэрца шчыра дзякуюць вялікі савецкі народ, бальшавіцкую партыю, свой урад і правадыра народаў усяго свету таварыша Сталіна. З небывалым уздымам працоўныя адначасна і актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіць партыя Леніна—Сталіна і савецкі ўрад. Мітынгі, прысвечаныя Указам Прэзідыума Вярхоўных Саветаў СССР і БССР аб назначэнні дня выбараў дэпутатаў, на якіх прысутнічала 19.000 чалавек, прадвыбарчыя сходы, на якіх прысутнічала 14.000 чалавек, яскрава паказваюць бязмежнае жаданне выбаршчыкаў раёна пасланць у сацыялістычны парламент лепшых сыноў і дачок народа, здольных па-бальшавіцку вырашаць дзяржаўныя пытанні і пасапраўднаму абараняць інтарэсы працоўных.

Сярод агітатараў раёна 196 батракоў, сялянскай моладзі і інтэлігенцыі. Яны штодзённа працуюць з выбаршчыкамі, несуць у масы бальшавіцкую праўду, вывучаюць у гуртках Канстытуцыю, выбарчы закон, знаёмяць слухачоў з кандыдатамі непераможнага Сталінскага блока камуністаў і беспартыйных. Агітатар тав. Ратынскі, ў мінулым батрак, рэгулярна праводзіць работу ў сваім гуртку. Заняткі гуртка ён праводзіць цікава, за што вельмі любяць яго слухачы.

Ва ўчастковых і акруговых выбарчых камісіях працуе 140 чалавек лепшых прадстаўнікоў працоўных раёна. Кожны з іх аддае ўсю ўвагу на ўзорную падрыхтоўку да выбараў. Настаўнік тав. Кляр — сакратар участковай выбарчай камісіі і інш. пасапраўднаму, добрасумленна адносяцца да даручанай ім работы.

Ажыццяўляючы кіраўніцтва ўсёй прадвыбарчай работай, наша маленькая партарганізацыя вядзе за сабой усё насельніцтва раёна з тым, каб у адзіным блоку з беспартыйнымі аддаць свае галасы дастойным людзям.

У складзе акруговых і ўчастковых выбарчых камісій працуюць 14 членаў партыі. 26 камуністаў працуюць даверанымі і кіраўнікамі агіткалектываў на выбарчых участках. Давераныя тав. Елісееў і старшыня участковай выбарчай камісіі тав. Іваноў арганізавалі ўзорную работу на сваім участку. Тав. Елісееў сістэматычна праводзіць семінар агітатараў і правярае іх работу. Выбаршчыкам участка паказана 5 кіно-карцін. Памяшканне ўчастка абсталявана і ўпрыгожана, устаноўлена дзяжурства членаў камісіі і арганізаван пакой кансультацыі, які працуе штодзённа з 5 да 8 гадзін вечара.

Таварышы Ганчароў, Рудзенка, Харчанка, Палуціс і інш. па-бальшавіцку выконваюць даручаную ім работу.

Нельга абысці той факт, што ў некаторых сельсаветах раёна маюцца недахопы ў падрыхтоўцы да выбараў. Не ўсюды абсталяваны выбарчыя участкі і маюцца перабоі ў агітацыйнай рабоце.

Ліквідаваць недахопы ў рабоце — задача сённяшняга дня. Спалучыўшы вялікую прадвыбарчую работу з выкананнем гаспадарчых задач, мы с поспехам правядзем выбары ў Вярхоўныя Саветы. Партыйная арганізацыя забяспечыць перамогу сталінскага блока камуністаў і беспартыйных у прадстаячых выбарах.

Таўкачоў — Сакратар Чыжаўскага РК КП(б)Б

НАШ КАНДЫДАТ

На прадвыбарчым сходзе інтэлігенцыі м. Зарэмба быў вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР тав. Вайткоўскі Александр Станіслававіч. Гэту прапанову сяляне ваколічных вёсак аднадушна падтрымалі. Асабліва рады мы, батракі.

Я ведаю тав. Вайткоўскага ўжо многа год. Разам з ім працавалі батракамі ў маёнтку пана Гарлеўскага. Вайткоўскі быў пастухом, а я плотнікам.

Дрэнна жылося батракам у пана. Працавалі ад зары да зары і вечна галадалі. Нават заробленага трэба было чакаць доўгі час, бо пан з намі не разлічваўся.

Мы не жадалі так жыць. І часта, сабраўшыся дзе-небудзь увечары, Александр Станіслававіч гаварыў нам: «Бачыце, мы працуем на пана, спіну не разгібаем, галадаем, а ў яго ад дабра свірны ломяцца».

На канкрэтных прыкладах тав. Вайткоўскі паказваў нам, хто вінават у тым, што мы дрэнна жывём.

Неяк даведаўшыся аб такіх размовах, пан Гарлеўскі звольніў тав. Вайткоўскага з работы і нават напісаў другім памешчыкам, каб Вайткоўскага не прымалі нідзе на работу.

Калі ў Заходнюю Беларусь прышла наша вызваліцельніца Чырвоная Армія і пачалі арганізоўвацца ў мястэчках і вёсках сялянскія камітэты, мы аднагалосна выбралі старшынёй тав. Вайткоўскага. Ён адразу-ж энергічна прыняўся за работу.

Па-першае, нам, батракам, ён распарадзіўся выплаціць запазычанасць, якая засталася ў пана.

Калі трэба было дзяліць панскую зямлю, адбылося вось што: частка зямлі была засеяна азімымі, а частка не, і кожны хацеў атрымаць засеянае. Тут-та нам на дапамогу прышоў тав. Вайткоўскі.

Ён сабраў нас і гаворыць: «Таварышы! Навошта мы будзем дзяліць зямлю. Інвентара: плугоў, барон і іншага—у нас не хопіць на ўсіх. Пагэтаму я прапаную апрацоўваць зямлю калектыўна. Разам будзем працаваць на ёй, разам збіраць ураджай. Раней мы працавалі на пана, цяпер папрацуем на сябе. Давайце арганізуем калгас. Партыйныя і савецкія арганізацыі дапамогуць нам».

Мы паслухалі яго, параіліся і аднадушна рашылі згадзіцца з прапановай тав. Вайткоўскага. Зараз нас 17 сямей у калгасе. Мы будзем добра працаваць, каб жыць так, як жывуць нашы браты калгаснікі ва ўсходніх абласцях Беларусі.

Зараз тав. Вайткоўскі працуе старшынёй Чыжаўскага сельскага савета. Гэта вялікі сельсавет. Сюды ўваходзяць 28 вёсак, і наш старшыня добра спраўляецца з даручанай яму справай.

Тав. Вайткоўскі вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Мы ўсе, як адзін, 24 сакавіка аддадзім за яго свае галасы.

Іван Радомскі

МАЯ РАБОТА З ВЫБАРШЧЫКАМІ

Работу ў гуртку па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона я распачаў 5 лютага. Гурток, у якім я праваджу заняткі, складаецца з 20 чалавек жыхароў вёскі Чыжава-Суткі. На працягу гэтых 20 дзён з сваімі слухачамі я правёў 5 заняткаў. Першую гутарку я правёў аб міжнародных падзеях. На астатніх 4-х занятках мы дэтальна вывучалі Канстытуцыю СССР і Палажэнне аб выбарах.

Сярод наведвальнікаў гуртка ёсць 13 таварышоў, якія мала разумеюць рускую і беларускую мову. Для гэтага я падабраў аднаго таварыша, які падрабязна растлумачвае ім Канстытуцыю і выбарчы закон на польскай мове. Удзельнікі гуртка вельмі зацікаўлены заняткамі і ўсе 20 чалавек актыўна прымаюць удзел у дзелавым абмеркаванні пытанняў. Пасля заняткаў яны заўсёды запрашаюць мяне прыхадзіць у другі раз.

Зараз я распачаў работу з выбаршчыкамі па азнаямленню іх з кандыдатамі, за якіх трэба будзе галасаваць. Я расказваю слухачам, хто такія нашы кандыдаты, чаму яны заслугоўваюць вялікага давер'я выбаршчыкаў.

Таварышы Андрэчык, Крыстаская і інш., гаворачы аб кандыдатах блока камуністаў і беспартыйных заявілі: «У былой панскай Польшчы выбаршчыкі не ведалі за каго іх прымушаюць галасаваць. Польскі ўрад баяўся паказаць сапраўдны твар кандыдатаў, бо ўсе яны былі злейшымі ворагамі працоўнага народа. Паны думалі, што пад іх бізуном мы ўсляпую будзем галасаваць за сваіх ворагаў, але на справе атрымлівалася адваротнае. Мы не галасавалі за іх.

Зараз мы, вызваленыя з-пад панскага гнёту, самі вылучаем сваіх кандыдатаў у дэпутаты, ведаем, што яны лепшыя прадстаўнікі нашага народа, і ў дзень выбараў мы ўсе, як адзін, аддадзім свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока камуністаў і беспартыйных».

Агітатар М. І. Ціклаўры.

РАСКАЗВАЕМ АБ КАНДЫДАТАХ

Я з'яўляюся даверанай па гарадскому выбарчаму ўчастку № 63, Чыжаўскай выбарчай акругі № 338. Па гэтай акрузе балатуюцца тав. Дз'ячук у Савет Саюза, тав. Турлейскі ў Савет Нацыянальнасцей і тав. Касцюк у Вярхоўны Савет БССР.

На нашым участку арганізавана 16 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет. Гурткі займаюцца адзін раз у два дні.

Зараз уся наша ўвага накіравана на тое, каб выбаршчыкі добра ведалі сваіх кандыдатаў. Ведалі іх працоўны і жыццёвы шлях. Для гэтага агітатары дэталёва расказваюць выбаршчыкам іх біяграфіі, — біяграфіі сапраўдных сыноў і дочак народа.

Усе агітатары зацікаўлены ў тым, каб выбаршчыкі добра зразумелі выбарчую сістэму і тэхніку галасавання. Пытанні выбаршчыкаў растлумачваюцца так, каб у іх не заставалася ніякага непаразумення.

Добра працуе агітатар тав. Вайнгольд (яна скончыла курсы савецкіх работнікаў і зараз працуе ў Райпо). На заняткі гуртка, якім яна кіруе, прыходзіць 45 чалавек.

Мы дабёмся таго, што 24 сакавіка ўсе выбаршчыкі, як адзін, прыдуць на выбарчы ўчастак і аддадуць свае галасы за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных.

Е. С. Лабацкая.



Кошт працадня ў калгасе «Чырвоны агароднік» Мінскага раёна ў 1939 годзе складала 25 рублёў. Кожны калгаснік атрымлівае на свой працадзень: 9 р. 80 коп. грашыма, 7 кгр. бульбы, 10 кгр. 600 грам агародніны і 1 кгр. 200 грам зерновых. Сям'я калгасніка М. В. Чэрняўскага, з якой у калгасе працавала 2 чалавекі, выпрацавала 724 працадні.

На здымку: калгаснік М. В. Чэрняўскі атрымлівае ад касіра сельгасарцелі выпрацаваныя яго сям'ёй на працадні 7.101 руб. (Фотахроніка БЕЛТА).

КАЛГАС „НОВАЕ ЖЫЦЦЁ"

Былыя батракі маёнтка графа Патоцкага, Бранскага раёна, у колькасці 33 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас, назву якому далі «Новае жыццё». Арганізацыйны сход прайшоў з вялікім уздымам.

Былыя батракі аднадушна адобрылі статут сельгасарцелі і далі абяцанне працаваць у калгасе чэсна і добрасумленна. На сходзе выбрана праўленне калгаса ў складзе 5 чалавек і рэвізійная камісія з 3-х чалавек.

На другі дзень калгаснікі прыступілі да абагулення жывёлы і сельгасінвентара згодна прынятага статута.

Агульны сход прыняў наступную рэзалюцыю:

«Цяжкім і невыносным было жыццё батракоў пры польскім урадзе. Доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прагнала з нашых зямель назаўсёды польскіх каланізатараў, дала нам і нашым дзецям свабоду і шчасце. Цяпер мы, былыя батракі, сталі свабоднымі грамадзянамі вялікага Савецкага Саюза і ад чыстага сэрца жадаем ісці нага ў ногу разам з усім вялікім савецкім народам. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў і яе правадыра, нашага бацькі і друга—любімага Сталіна, мы будзем будаваць новае бясклассавае соцыялістычнае грамадства.

Мы, былыя батракі, азнаёміўшыся з Сталінскім статутам сельгасарцелі, поўнасцю яго прымаем і з сёньняшняга дня аднадушна ўступаем у калгас».

Калгаснікі абавязаліся ўзорна падрыхтавацца да першай савецкай вясны.

Карабань

ПЕРШЫЯ КАЛГАСЫ Ў ГРОДНЕНСКІМ РАЁНЕ

У Гродненскі райком КП(б)Б і райвыканкам з вёсак штодзённа прыходзяць хадакі, якія прыносяць заявы аб жаданні многіх сялян арганізаваць калгасы. Усяго паступіла такіх заяў ад беднякоў, батракоў і серадняков з 8-мі вёсак. На сваіх сходах сяляне вывучаюць статут сельскагаспадарчай арцелі, надзвычай цікавяцца посьпехамі калгасаў Савецкага Саюза.

Днямі ў вёсцы Лаша адбыўся сход сялян, якія падалі заявы аб уступленні ў калгас. На сходзе прысутнічалі амаль усе сяляне вёскі. Сход аднагалосна прыняў статут сельскагаспадарчай арцелі і рашыў арганізаваць у вёсцы калгас.

На сходзе было выбрана праўленне і рэвізійная камісія калгаса. Старшынёй калгаса выбран тав. Салей Антон Фаміч. У састаў праўлення выбраны дзве жанчыны.

У вёсцы Свіслач таксама арганізаван калгас, у які ўступіла 24 гаспадаркі. Выбранае праўленне арцелі прыступіла да работы.

В. Гарбанёў

НАСЦЕНГАЗЕТА НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

Гродна, (Наш кар.) Па Савецкай вуліцы, у школе № 15, знаходзіцца 8-ы выбарчы ўчастак. Пакоі, адведзеныя пад участак, упрыгожаны лозунгамі, плакатамі і партрэтамі правадыроў партыі і ўрада. Тут маюцца газеты, журналы і выбарчая літаратура. На сцяне ў вялікай раме — Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. Увагу прыцягвае добра афармленая і ілюстраваная участковая насценгазета «Свабодны выбаршчык». Каля яе стаяць некалькі выбаршчыкаў і ўважліва чытаюць.

Насценгазета „Свабодны выбаршчык" карыстаецца папулярнасцю сярод выбаршчыкаў.

Аб чым піша насценная газета? Перад намі першы нумар газеты. Перадавы артыкул яе прысвечаны XXII гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога флота. Артыкул напісаны проста і зразумелай кожнаму выбаршчыку мовай. У нумары прынялі ўдзел тт. Шпільман, Лебедзеў, Забалотны, Сорцар, Іонас і інш. Агітатары падзяліліся ў насценгазеце вопытам сваёй работы.

„Мне даручана агітацыйная работа ў дамах №№ 3 і 4 па вуліцы Пасіянары, — піша ў сваім артыкуле агітатар Забіяка.—Сваю работу я пачаў з таго, што асабіста абышоў кватэры і пазнаёміўся з выбаршчыкамі. Усюды мяне сустракалі як госця, усюды завязвалася ажыўленая гутарка. У адной кватэры я сустрэў старыка т. Любіча, які вельмі цікавіўся пытаннем жыцця працоўных у Савецкім Саюзе. Ён не задаволіўся кароткай гутаркай, а пажадаў займацца ў гуртку. Такіх выбаршчыкаў не мала, яны дапамаглі мне наладзіць работу гуртка па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР".

Маладая выбаршчыца тав. М. Іонас у заметцы піша, што „дзень выбараў для яе з'явіцца самай яркай падзеяй у жыцці. Яна ўпершыню будзе прымаць удзел у выбарах і з радасцю аддасць свой голас за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных". Тав. М. Іонас актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да выбараў і заклікае выбаршчыкаў паследаваць яе прыкладу.

Наступны нумар насценгазеты прысвячаецца пытанням праверкі спіскаў выбаршчыкаў і агітацыі за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета, зарэгістраванага па выбарчай акрузе.

Так насценгазета асвятляе ход выбарчай кампаніі па свайму ўчастку.

В. Г.



Тэкстыльшчыкі Беластока сустракаюць выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР новымі дасягненнямі ў павышэнні прадукцыйнасці працы.

На здымку: ткачы камбіната № 1 віншуюць свайго таварыша — маладога ткача Яшу Ліфшыца, які першы ў Беластоку перайшоў на абслугоўванне 4-х ткацкіх станкоў, павялічыўшы прадукцыйнасць працы больш чым на 400%. (Фотахроніка БЕЛТА).

ТЭЛЕГРАМЫ

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГЕРМАНСКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО

Берлін, 27 лютага. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што ў ноч на 27 лютага германскія разведчыя самалёты зрабілі палёты над цэнтральнымі раёнамі Францыі і над Парыжам. Яны выканалі сваю задачу, не гледзячы на канцэнтраваны агонь французскай зенітнай артылерыі. Усе германскія самалёты вярнуліся раніцой 27 лютага без страт на свае базы.

Самалёты саюзнікаў у гэту-ж ноч пралятаді над германскай бухтай. Асобныя самалёты праціўніка пралятаді над Кілем і дасягнулі ракі Эльбы. Замежныя паведамленні, згодна якім самалёты саюзнікаў дасягнулі Берліна, не адпавядаюць сапраўднасці. Адзін англійскі самалёт быў пашкоджан снарадам зенітнай артылерыі, пачаў губляць вышыню і павінен быў узяць адваротны курс. Англійскі разведчы самалёт тыпу «Брыстоль-Блонхейм» збіт сёння ў другой палавіне дня над германскай бухтай германскімі знішчальнікамі.

ВАЙНА НА МОРЫ

Лондан, 28 лютага. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, нарвежскі параход «Арнфінз» сутыкнуўся з падводнай лодкай, якая, як відаць, атрымала прабоіну і затанула. Параход аднесла да пабярэжжа Нарвегіі. Каманда выратавана.

Англійскі ваенны карабль высадзіў у Шатландыі 17 пасажыраў шведскага парахода «Норднія», затануўшага каля Галандыі. Двое загінула.

Англійскі параход «Эфон» затануў у Паўночным моры. 19 чалавек з застава каманды дастаўлены галандскім параходам у Англію. Мяркуюць, што астатнія члены экіпажа таксама выратаваліся.

Берлін, 28 лютага. (ТАСС). Па паведамленню германскага інфармацыйнага бюро, 21 лютага на шляху ад Азорскіх астравоў да Мадэрэ французская падводная лодка спыніла і абшукала партугальскі параход. Два немцы, якія знаходзіліся на караблі, затрыманы.

ДА ІНЦЫДЭНТА З «АСАМА-МАРУ»

Токіо, 28 лютага. (ТАСС). Агенцтва «Дамей цусін» перадае заяву прадстаўніка міністэрства замежных спраў Японіі ў сувязі з інцыдэнтам з японскім параходам «Асама-мару». Прадстаўнік міністэрства заявіў, што англійскі пасол у Токіо Крэйгі наведаў віцэ-міністра замежных спраў Тані, у гутарцы з якім закранался пытанне аб звароце 9 германскіх пасажыраў, знятых англічанамі з «Асама-мару». Стораны дасягнулі пагаднення, якое ўстанаўлівае месца і дату перадачы Японіі гэтых пасажыраў.

Падпальшчыкі вайны ў Скандынавіі

Інтрыгі англа-французскага блока, імкнучагася распаўсюдзіць пажар вайны і на Скандынавію, выклікаюць ва ўсіх нейтральных краінах усё растучы непакой. У Лондане і Парыжы моцна разачараваны нядаўнай заявай шведскага прэм'ера Гансона. Англа-французскія падпальшчыкі вайны выкарыстоўваюць розныя формы нажыму, каб заставіць Швецыю і Нарвегію ўступіць ва ўзброены канфлікт. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, тон парыжскага і лонданскага друку, які падняў нябачаную да гэтага часу траўлю пазіцыі шведскага ўрада.

Блюм прызывае Стакгольм і Осло „апамятацца" — неадкладна адмовіцца ад палітыкі нейтралітэта і ўступіць на шлях вайны ў імя выратавання „сястры Фінляндыі". „Незалежна ад таго, ці пагадняюцца з гэтым скандынаўскія краіны або не, — піша Блюм, — Фінляндыя з'яўляецца авангардам, які іх прыкрывае. Гэта павінны зразумець як у Стакгольме, так і ў Осло".

Лонданская „Дэйли мейль" прама пагражае: Адказ Швецыі адаб'ецца на ёй самой. Швецыя яшчэ будзе мець горкі повад раскайвацца ў сваім цяперашнім рашэнні".

Найбольш адкрытыя каментарыі французскай газеты „Эпок". Газета заяўляе, што „скандынаўскім краінам прадстаяць змрочныя дні. У апошнія тыдні арэнай найвялікшага напружання былі Балканы, цяпер гэтай арэнай стала Скандынавія. Нарвегія рана ці позна павінна будзе ўключыцца ў вайну".

Аб гэтым-жа кажа Пертынакс у „Ордр". Ён піша: „Неабходна заявіць, павінен быць прыменен „дынамічны нейтралітэт". Пертынакс недвухсэнсоўна патрабуе, каб англійская і французская эскадры „дапамаглі" Нарвегіі захаваць „дынамічны нейтралітэт". А гэта азначае на справе, не цяжка ўстанавіць, успомніўшы нядаўна інцыдэнт, які адбыўся з параходам „Альтмарк", калі англійскія ваенныя караблі нагла нарушылі суверэнныя правы Нарвегіі.

Падпальшчыкі вайны дзейнічаюць не толькі пагрозамі, запалохваннем. Яны выналходзяць новыя выкруты для таго, каб „пераканаць" шведскі ўрад уступіць у вайну на старане белафінаў. Аднак-жа заява Гансона аб нейтралітэце, — цвердзяць зараз старонкі лонданскага і парыжскага друку, — не супярэчыць аказанню ўзброенай дапамогі Манергейму. Нейтралітэт — паняцце фармальнае і адноснае. Можна захоўваць нейтралітэт і аказваць дапамогу „дабравольнымі" брыгадамі і нават дывізіямі. Калі-небудзь гэта і карысней. „Шліце матэрыялы і людзей!" Прапускайце валанцёраў з другіх краін! Гэта не супярэчыць нейтралітэту!" — лемантуюць „Дэйлі экспрэс" і іншыя газеты.

Ва ўсіх краінах Паўночнай Еўропы з трывогай сочаць за махінацыямі падпальшчыкаў вайны. Пасля цвёрдай заявы шведскага ўрада ёсць аснова меркаваць, што скандынаўскія краіны і надалей не паддадуцца на посулы, устаяць перад пагрозамі Лондана і Парыжа, не пойдуць на правакацыі і нарушэнне нейтралітэта.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАЎДНЕВЫМ КІТАІ

У паўднёвай часці правінцыі Гуансі бai ідуць на паўнач ад Наньніна. Горад, як высвятляецца, знаходзіцца ў руках японцаў. На шосе Наньнін—Біньян, у раёне Саньтана, японскія войскі, узмацніўшы свае часці пасля панесеных страт, зноў атакавалі кітайскія пазіцыі, але былі адбіты.

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У паўночнай часці правінцыі Чжэцзян, на фронце ў раёне Сяошань, — зацішша. Японскае камандаванне штодзённа пасылае сюды новыя падмацаванні. Мяркуецца, што ў бліжэйшы час японцы прадпрымуць тут вялікае наступленне.

У правінцыі Дзянсі, паўднёва-заходней Наньчана, кітайскія войскі нядаўна зрабілі ўдалы налёт на японскія пазіцыі ў Гаойушы. Японскія страты вылічваюцца ў 200 чалавек забітымі і раненымі. Кітайцы захапілі 100 японскіх вінтовак. У паўднёва-усходняй часці правінцыі Аньхуэй кітайскія войскі развіваюць паспяховае наступленне ў сектары Фаньчан.

У паўднёвай часці правінцыі Хэнань кітайскія часці 23 лютага атакавалі знешную лінію японскай абароны ў сектары Сіньян.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У заходняй часці правінцыі Суйюань кітайскія войскі працягваюць сціскаць кальцо вакол Уюаня. Перадавыя кітайскія часці ўжо падышлі к гораду і вядуць бai ў яго ваколіцах. Днямі вялікія бai адбываліся на поўдзень і поўнач ад Уюаня. Адна з кітайскіх часцей, прасоўваючыся ўздоўж Уюань—Баотаўскага шасе, 21 лютага атакавала Улашухай (у 75 кілометрах паўднёва-ўсходней Уюаня).

28 лютага. (ТАСС).

РЭАКЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ АНГЛІЙСКІХ ПРОФБЮРАКРАТАЎ

Лондан, 28 лютага. (ТАСС). Газета «Дэйлі уоркер» паведамляе, што тры відных дзеячы аб'еднанага саюза машынабудаўнікоў распрацоўваюць прапанову, згодна якой выканаўчы камітэт саюза павінен узяць на сябе на час вайны «надзвычайныя паўнамоцтвы». Калі выканаўчы камітэт пры́ме на сябе падобныя паўнамоцтвы, то ўрад аднясецца да гэтага вельмі прыхільна, бо ён занепакоен рухам рабочых за павышэнне зарабатнай платы. Газета ўказвае, што прадпрынята пэўныя крокі для прадастаўлення выканаўчаму камітэту дыктатарскіх праў, што ставіць пад пагрозу дэмакратычныя правы членаў саюза. Калі выканаўчаму камітэту ўдасца ажыццявіць гэты манеўр, то ён зможа пад прадлогам надзвычайнага становішча ў краіне адмяніць штогодную канферэнцыю саюза, якая павінна быць склікана ў маі. Акрамя таго, выканаўчы камітэт аб'еднанага саюза машынабудаўнікоў мяркуе ўвесці далейшыя абмежаванні для членаў саюза — комуністаў. Не падлягае сумненню, што нацыянальная канферэнцыя адхіліла-б усе гэтыя новыя мерапрыемствы.

АНГЛІЙСКІЯ РАБОЧЫЯ АСУДЖАЮЦЬ ПАЛІТЫКУ ЛЕЙБАРЫСЦКІХ ЛІДЭРАЎ

Лондан, 28 лютага. (ТАСС). У Лондане адбылася канферэнцыя саюза будаўнічых рабочых, на якой былі прадстаўлены 53 саюзы. Не гледзячы на тое, што на канферэнцыі прысутнічаў член генеральнага совета трэд-юніёнаў Хікс, дэлегаты прынялі рэзалюцыю, у якой рашуча асудзілі цяперашнюю вайну, якая вядзецца ў інтарэсах капіталістаў, і патрабуюць ад генеральнага совета неадкладнага спынення супрацоўніцтва з урадам і адкрыцця перагавораў аб павышэнні заработнай платы.

Англійскія грамадскія арганізацыі ўдзяляюць многа ўвагі адбыўшайся днямі ў Нью-Кастле канферэнцыі членаў таварыства «Рашэ тудэй». Да рэзалюцыі гэтай канферэнцыі далучыліся асобныя аддзяленні саюза машыністаў і качагараў Гейтсхэда і Даманкшыра (Лондан), а таксама члены лейбарысцкага саюза пры Оксфордскім універсітэце. Усе яны адабраюць дзеянні Совецкага Саюза, дапамагаючага фінляндскаму народу вызваліцца ад панавання белафінаў, і асуджаюць антысовецкую кампанію англійскай буржуазіі і лейбарысцкіх лідэраў.

КОРАТКА

Па паведамленню „Нью-Йорк таймс", з Індыі ў США прыбыла золата на суму ў 600 тысяч долараў.



На здымку: тав. Панькоўская Ядвіга, лепшая работніца матальнага цэха плюшавай фабрыкі № 31 у г. Беластоку. (Фота Сапір).

ПА ГОРАДУ І ОБЛАСЦІ

САЮЗ КАМПАЗІТАРАЎ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР

У беластоцкім абласным аддзеле мастацтва адбыўся арганізацыйны сход кампазітараў, пражываючых у гор. Беластоку.

Дырыжор і мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі тав. Ш. З. Шэпер пазнаёміў прысутных з умовамі працы кампазітараў у Совецкім Саюзе.

Выбрана оргбюро саюза кампазітараў заходніх абласцей БССР.

БАРАЦЬБА СА СПЕКУЛЯЦЫЯЙ

На падставе праверак, праведзеных гандлёвым аддзелам Беластоцкага горвыканкома, установлена, што прыватныя гандляры Шлягман Ш. І., пражываючы па Гродненскай вуліцы, Анц Б. А., пражываючы па Скарупскай вул., Шушыцкі І. Г., пражываючы па Школьнай вул., Біндэр О. І. (Суражская вул.) і Браскіна Р. А. (Рабінская вул.), не гледзячы на рад папярэджанняў з боку гандлёвага аддзела горвыканкома, прадавалі прадукты шырокага спажывання па спекуляцыйных цэнах, а імена: кг. сахару за 50 руб. замест 5, канфеты 80 руб. кг. замест 6, мыла гаспадарчае 2-га сорту па 100 руб. кг. замест 2 руб. 90 коп. і г. д.

Горвыканком аштрафаваў гандляроў Шлягмана, Шушыцкага і Біндэра ў суме 10.000 рублёў, Анца — 5000 руб., і Браскіну — у 3000 руб., абавязаўшы іх на працягу трохдзённага тэрміну ўнесці грошы ў касу горфінаддзела.

ВЫРАБ МАХОРКІ

На Беластоцкай дзяржаўнай табачнай фабрыкі працуе зараз 110 чалавек. На фабрыцы вырабляецца махорка і нюхацельны табак.

3 верасня 1939 года да 1-га лютага 1940 г. фабрыка выпусціла 82.245 кілаграмаў махоркі.

НОВЫЯ ДАРОГІ І МАСТЫ

Згодна плану, распрацаванаму Беластоцкім абласным дарожным аддзелам, зацверджанаму Соўнаркомам БССР, у 1940 годзе ў Беластоцкай вобласці будзе пабудавана звыш 300 кіламетраў новых дарог, у тым ліку палепшаныя грунтовыя, гравійныя і замошчаныя каменем. Больш трохсот кіламетраў дарог акрамя гэтага будзе адрамантавана.

Планам прадугледжаны таксама рамонт многіх існуючых мастоў і пабудова новых.

Агульная каштоўнасць усіх работ па новаму будаўніцтву дарог і мастоў і капітальнаму рамонту складае 34.410.700 рублёў. На выдаткі, звязаныя з бягучым рамонтам і ўтрыманнем дарог і мастоў асігнуецца 13.180.000 рублёў.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 239

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.